а. Леў Гарошка.

ДУША

КАРОТКІ АПОЛЁГЭТЫЧНЫ НАРЫС

Выданьне Беларускае Рэлігійнае Місіі

ПАРЫЖ -:- 1948

З дазволу духоўнае ўлады.

Надзвычайная сіла.

Каму даводзіцца аглядаць пажарышчы, або разбураныя паводкаю ці навальніцамі ваколіцы, заўсёды напрошваецца тады сказ: «Якія страшэнныя сілы, якія шалёныя стыхіі ёсьць у прыродзе!» Няма ніякае меры ні ліку, каб азначыць гэтыя сілы, каб іх ацаніць хоць прыблізна і ў параўнаньні да іх чалавек здаецца дробнаю бясьсільнаю істотаю. Аднак гэтая дробная істота — чалавек, стае да змаганьня з гэнымі сіламі і ў вялікай ступені іх перамагае; шчэ больш! іх падпарадкоўвае і выкарыстоўвае сабе на службу. — Бурныя рэчкі чалавек заставіў круціць млынавыя і фабрычныя турбіны; вецер з посьвістам і злосьцю круціць розныя ветракі, а агонь суправаджае амаль усё жыцьцё чалавека; ён і грэе, ён і гатуе, ён і дабывае нязьлічаную энэргію для фабрыкаў і заводаў.

Наймацнейшыя і найдзічэйшыя жывёлы чалавек так-жа змог упакарыць сабе, а колькі з іх сабе зусім асвоіў! — Як пакорна і рахмана лашчыцца перад чалавекам конь, карова, вярблюд і слон!

Чым-жа чалавек змог гэта ўсё сабе падпарадкаваць? Чым змог адолець гэтыя сілы?

Не сваёю фізычнаю сілаю, бо яе ў чалавека параўнаўча замала, але сваім р о з у м а м!

Усе матэрыяльныя сілы маюць свае меры. Іх мераюць то на кіляграмамэтры, то на «конскія сілы». Кожная матэрыяльная рэч так-жа можа быць памерана і зважана ці на кіляграмы, ці на мэтры. Тымчасам на розум няма ніякае меркі ні вагі. Кажуць: больш разумны, менш разумны, вельмі разумны, але гэтае «вельмі», так сама як «больш» і «менш» нічым не азначаецца. Чаму так? Бо розум належыць да тых субстанцыяў, якія ня маюць нічога матэрыяльнага, ён зьяўляецца адною з духовых сілаў нашае душы. Дзякуючы прысутнасьці гэтае сілы чалавек ёсьць чалавекам ува ўсёй сваёй велічы, магутнасьці, і значэньні, не зважаючы на сваю фізычную маленькасьць, зьнікомасьць.

Пазнаць сваю душу, значыць пазнаць самога сябе, а як-жа жыць сябе ня ведаючы? Тымбольш гэта патрэбна, што ёсьць ня мала подшаптаў з розных бакоў, якія выкарыстоўваюць усе цяжкасьці для пазнаньня духовае душы, каб зьвесьці чалавека на памылковы шлях, таму ў гэтым кароценькім нарысе зьвернем асаблівую ўвагу на гэныя цяжкасьці.

Нябачныя сілы.

Душа належыць да тых сілаў, якіх нельга бачыць, аднак у прыродзе ёсьць шмат, можа й вельмі шмат нават матэрыяльных сілаў, якіх нельга бачыць і беспасрэдна адчуваць іншымі нашымі змысламі, тымчасам яны існуюць, мы ў іх абяртаемся і нават не адчуваем, напр.: магнэтызм, гравітацыя, розныя патэнцыяльныя энэргіі, электрычнасьць і т. п. Вывучаюцца гэтыя сілы ў меру іх праяўленьня. Так-жа й душу хоць яе ня бачым вачыма, пазнаём розумам з яе дзейнасьці. Слаўны фізыялёг Фолькман Аль. казаў: «Мы ня можам бачыць і намацваць сілаў, якія дзейніча-

юць паводля пляну, але мы можам рабіць выснаўкі аб іх існаваньні па выніках іх працы... Калі-б у пустыні, дзе паводля нашае думкі ня ступала людзкая нага, мы наткнуліся на будынак з чэсаных каменьняў і склееных вапнаю, дык нам стане зусім ясна, што яно рабілася з нейкаю мэтаю і паводля раней абдуманага пляну. Але арганічнае цела куды больш плянамернае чым такая будыніна. Галоўную прычыну кожнага арганічнага разьвою я бачу ў валоданьні аднае разумнае сілы, якая дзейнічае паводля азначанага пляну і каторая выбірае неабходныя для ўзьнікненьня ўмовы».

Розныя ступені жыцьця.

Жывых істотаў на зямлі цэлыя мільёны, але душу маюць толькі людзі. Ня трэба быць вялікім дасьледнікам прыроды, каб пабачыць, што ёсьць розныя ступені жыцьця.

Найпрасьцейшым (вэгэтатыўным) жыцьцём жывуць расьліны; яны толькі маюць перамену матэрыі — аджыўляюцца, павялічваюцца ў абыйме — растуць і размнажаюцца.

Жывёлы маюць усе азнакі расьліннага-вэгэтатыўнага жыцьця, але да таго яны 'шчэ могуць рухацца, адчуваць ды рэагаваць на вонкавыя падражненьні.

Чалавек мае ўсе азнакі абедзьвех папярэдніх ступеняў жыцьця, але да таго яшчэ разумовае, духовае жыцьцё.

Калі для выясьненьня расьліннага (вэгэтатыўнага) і жывёльнага жыцьця здавальняюча прызнаць у іх просты, але нядуховы жыцьцёвы прынцып, дык для разумовага й духовага жыцьця неабходна нешта зусім адменнае ад матэрыі і шмат вышэйшае за яе — духовую душу.

Што-ж гэта такое **душа?**

Душою называем самы ўнутраны носьбіт жыцьця чалавека, апошні і найглыбейшы прынцып быцьця й дзейнасьці — сілу, на моцы якое чалавек расьце, аджыўляецца, адчувае, хоча, думае і распазнае.

Навонках праяўляецца душа праз дзеяньне сваіх сілаў: розуму і вольнае волі.

Душа і цела.

У чалавеку душа і цела так цесна зьвязаны з сабою, што іх разьдзяліць можа толькі сьмерць. Ані сама душа, ані тымбольш самое цела, не становяць чалавека. Але былі раней і сёньня ёсьць ня мала людзей, якія ня прызнаюць душы зусім. Гэта будуць розныя матэрыялісты, якія агулам ня прызнаюць існаваньня духу ў прыродзе. Для іх чалавек — гэта жывёла, толькі што больш разьвітая. Самое слова «душа» яны штопраўда ўжываюць, але ў тым значэньні, што гэта ёсьць сукупнасьць дзеяньня нэрваў і мазгоў. Калі-ж мы спытаем матэрыялістаў: «Хто кіруе працаю нэрваў і мазгоў?» дык пачуем адказ: «Яны самі ёсьць кіраўнікамі». Выходзіць, што спраўны радыёапарат, які мае беззаганныя лямпы, цэлыя правады, спраўныя кандэнсатары, мэмбрану, антэну і ўсе іншыя неабходныя часткі будзе дзейнічаць сам і кіраваць сабою, калі-б нават ня дзейнічала ніводная надаўчая станцыя, калі-б ня было нідзе ніякага кіраўніка, што кіруе надаўчаю станцыяю.

У чалавеку такім нябачным кіраўніком разумовае дзейнасьці і мазгоў і нэрваў і ўсіх іншых органаў ёсьць душа.

ДУША І МАЗГІ.

Але матэрыялісты рознымі спосабамі стараюцца даказаць, што душа гэта нічога іншага, як мазгі.

Разглянем галаўнейшыя з іх «доказаў»:

«Без мазгоў няма думаньня».

Выхадным пунктам для матэрыялістаў ёсьць факт, што без мазгоў немагчымае думаньне. Адгэтуль робяць выснавак: «значыць мазгі прадукуюць думку». Некаторыя для большае яснасьці дадаюць: «Як печань вытварае жоўць, так мазгі вытвараюць думку».

Запраўды без мазгоў думаньне немагчымае, бо людзкая думка заўсёды патрабуе абразоў, абразы-ж вытварае фантазія, а фантазія цесна зьвязана з змысловым адчуваньнем і мазгамі. Але ці-ж можна з гэтага рабіць выснавак, што мазгі вытвараюць думку? Дык-жа ніводзін майстар на сьвеце ня робіць бяз прылады. «Бяз прылады й вераб'я не заб'еш», кажа беларуская прыказка. Ці бачыў хто калі такога музыканта, каб выканаў мэлёдыю бяз скрыпкі і смыка? Дык хто грае? ці сама скрыпка, ці музыкант? Так як скрыпка для музыкі, як прылада для майстра — патрэбны мазгі для душы.

Але гэта ня ўсё. Здавён-даўна заўважана, што тым органам, які найбольш розьніць чалавека ад жывёлаў, ёсьць мазгі, таму за ўсякую цану старaліся ў мазгох знайсьці нейкі фактар, які-б вытвараў інтэлігэнцыю чалавека. Доўга ня думаючы, цьвердзілі, што інтэлігэнцыя залежыць ад велічыні, складкаў, формы і хэмічнага складу мазгоў. Так гаварылі раней, але факты паказалі іншае.

Велічыня мазгоў.

Запраўды чалавек параўнаўча да іншых жывёлаў мае больш мазгоў. Мазгі найбольш разьвітых чалавекападобных малпаў не перавышаюць 600 гр., а мазгі найменш разьвітага чалавека маюць больш за 1.200 гр. Але з гэтага выходзіла-б, што нават спаміж людзей, той, хто мае больш мазгоў мусіў-бы быць разумнейшы. У гэтым кірунку даўжэйшы час вяліся дакладныя досьледы, аднак вынік іх быў зусім непажадны для матэрыялістаў, бо выявілася, што шмат выдатных людзей навукі мела запраўды мазгоў больш, але ня мала было выдатных і вучоных людзей, якія мелі мазгоў менш чым сярэдні чалавек. Вось некалькі фактаў:

Тургенев рас. пісьменьнік — 2020 гр.
Кувье фр. прыродавед — 1830 гр.
Абэркромбі анг. мэдык — 1730 —
Такэрэй анг. пісьменьнік — 1660 —
Шпурцгайм ням. мэдык — 1560 —
Дірішле ням. матэматык — 1520 —
Вэбстэр амэр. філялёг — 1520 —
Гэльмгольц ням. філязоф — 1500 —
Гаус ням. матэматык — 1490 —
Брока фр. хірург — 1484 —
Дюпютрэн фр. хірург — 1440 —
Грот анг. гісторык — 1403
Сярэдні эўрапэец мужч. — **1372** гр. жанч. **1231.**
Гамбэта фр. палітык — 1315 —
Гэрман англ. філялёг — 1260 —
Ляйбніц ням. філязоф — 1257 —
Гаусман ням. хэмік — 1230 —
Дэлінгэр ням. багаслоў — 1207 —

Ведамы мэдык праф. Рудольф Вагнэр важыў аж 964 людзкія мазгі і канчаткова прыйшоў да высноўку, што самая вага не зьяўляецца ніякім паказчыкам людзкое інтэлігэнцыі, а на дадатак

выдатны нэўралёг, Лелю, на аснове свае доўгагадовае практыкі ў шпіталю для ўмыслова хворых мусіў сьцьвердзіць, што там больш палавіны хворых маюць абыймо чэрапа больш за сярэдняе.

Гэтак сама хутка адпала другая «азнака інтэлігэнцыі», якою, паводля матэрыялістаў, мелі быць прапарцыянальныя суадносіны між мазгом і целам. Запраўды ў чалавека гэтыя адносны ў сярэднім ёсьць 1/47, а ў вышэйшых чалавекападобных малпаў каля 1/100, а ў кіта 1/900. Але вось у Амэрыцы жыве невялічкая хвастатая малпа уістіті, у якое гэтыя адносіны большыя чым у чалавека, аднак яе ўсе ўважаюць найніжэйшаю з роду прыматаў. Таксама неадрэчы будзе заўважыць, што ў кажаноў гэтыя суадносіны большыя чым у сабакаў, а інтэлігэнцыя — наадварот.

Хвалды мазгавое кары.

Заўважыўшы, што мазгавая кара нармальна разьвітага чалавека, мае густыя хвалды, а мазгі ідыётаў і крэтынаў азначаюцца малою колькасьцю гэтых, было пастаўлена цьверджаньне, што ў гусьціні мазговых хвалдаў ёсьць уся сутнасьць людзкое інтэлігэнцыі. Тымчасам глянуўшы на мазгі слана ці асла даводзіцца сьцьвердзіць, што ў іх ня менш хвалдаў на мазгох чымся ў чалавека. Не без значэньня ёсьць так-жа той факт, што мазгі сабакі й каня амаль зусім пазбаўлены хвалдаў хоць у ўмысловым разьвіцьці яны стаяць шмат вышэй за шматлікіх жывёлаў, у якіх мазгох гэткія хвалды ёсьць.

Хэмічны склад мазгоў.

Сьледам за Бальзакам некаторыя фізыялёгі казалі: «Чалавек будзе ідыёт, калі яго мазгі ня

маюць фосфару; вар'ятам — калі маюць фосфару зашмат; нармальным — калі маюць малавата; гэніем — калі мазгі насычаны фосфарам здавальняюча». З гэтага выходзіла-б, што фосфар ёсьць галоўным дзейнікам інтэлігэнцыі. Тымчасам пазьнейшыя досьледы выявілі, што мазгі рыбаў маюць фосфару даволі шмат, але розуму ня вельмі. Да таго досьледы мазгоў вар'ятаў выявілі, што ў іх толькі сама фосфару, колькі і ў нармальнага чалавека.

Бясспрэчна, што розныя хэмічныя складнікі могуць быць большымі, або меншымі штуршкамі да больш інтэнсыўнае ўмысловае працы, але не яны ёю кіруюць. Як-бы сам хэмічны склад мозгу станавіў інтэлігэнцыю чалавека, тады лёгка было-б высьледзіць гэты склад і адпаведным харчаваньнем вытварыць давольную колькасьць разумных людзей; гэніяў. Але рэчаіснасьць сьведчыць аб чым іншым; што дурань і разумны кормяцца з аднаго стала і аднаго паўміска і гэта іх не зьмяняе.

Сьледам за др. Брока ад 1870 г. шматлікія лекары і фізыялёгі стараліся падзяліць увесь людзкі мозаг на розныя змыслова-пачуцьцёвыя і матарычныя (рухаючыя) цэнтры. У гэтым напрамку вяліся шматлікія досьледы. З году ў год расьлі дагадкі і схэмы падзелу, але адначасна расьлі й цяжкасьці. Запраўды ўдалося азначыць шмат матарычных цэнтраў, але дакладна іх разьмежаваць аніяк не ўдалося, але найбольш няпрыемна для матэрыялістаў, што ня знойдзена ў мазгох ніякага цэнтру і мейсца для памяці; і сёньня мазгавыя хірургі і псыхалёгі адназгодны ў тым, што памяці нельга злёкалізаваць у ніводнай частцы мазгоў. Гэтым самым нельга азначыць цэнтру думаньня й суджаньня, а гэта-ж найважнейшыя праявы разумовае дзейнасьці.

Арганічныя пашкоджаньні мазгоў і псыхічныя закалоты.

Здаўна ведама, што арганічныя пашкоджаньні мазгоў выклікаюць большыя ці меншыя псыхічныя і разумовыя закалоты, дык матэрыялісты й робяць з гэтага выснавак: значыць мазгі й душа гэта тое самае.

Ці-ж ня праўды? Калі музыканту даць паламаную скрыпку і на ёй парваць струны, хай-жа на ёй тады заграе! Але ці з гэтага нехта зробіць выснавак, што няма музыкі, значыць няма й музыканта?

Мала таго што гэткі выснавак страшэнна недарэчны, але нават сам факт не заўсёды і ня зусім праўдзівы, бо пашкоджаньне мазгоў выклікае ў некаторых выпадках забураньне толькі ў матарычных цэнтрах, не закранаючы самога думаньня. Часта здараюцца выпадкі, што арганічнае пашкоджаньне мазгоў выклікае ненармальнасьці ў гутарцы, пісаньні, руху некаторых органаў або і зусім унемагчымлівае іх, але зусім ня выклікае замяшаньня ў думаньні, як аб гэтым сьцьвердзіў др. П. Морі які даўжэйшы час займаўся гэткімі хворымі і вынікі свае працы апублікаваў друкам ў 1939 г.

А ўжо зусім кладзе на лапаткі ўсякія выкруты матэрыялістаў факт апублікаваны праф. І. Лермітам у 1937 г., з яго практыкі над чатырмя хворымі, якім было выразана па адной мазгавой паўкулі і пасьля гэтага хворыя ня выказвалі ніякіх псыхічных замяшаньняў. Наадварот, адзін з іх, які да апэрацыі быў страціў мову, з прычыны вераду на левай мазгавой паўкулі, пасьля апэрацыі пачаў нармальна гаварыць, другі так добра сябе пачуваў, што выказваў лекару прылюдную падзяку.

СУАДНОСІНЫ МІЖ МАЗГАМІ І ДУШОЮ.

Вышэйпералічаныя факты здавальняюча ясна паказваюць, што нельга атоесамліваць душу з мазгом, як нельга атоесамліваць майстра з прыладаю, якою ён карыстаецца. Калі аднак для паясьненьня суадносін між душою і целам бяром гэты прыклад, дык адначасна трэба зрабіць засьцярогу, што між душою і мазгом, ці агулам целам ёсьць больш цесны зьвязок, чым між майстрам і прыладаю. Ані сама душа, ані самое цела не зьяўляюцца чалавекам, толькі іхняе спалучэньне творыць чалавека. Да выкананьня сваіх тувемных актаў душа ня толькі патрабуе цела, але яна ад яго залежная ў сваім дзеяньні. З гэтага зусім слушна вынікае, што чым дасканалейшым будзе цела, асабліва мазгі, тым лепш душа зможа выканаць сваю працу. Тут прыклад із скрыпачом і скрыпкаю добра гэта паказвае: Чым лепшай будзе скрыпка, тым лепш музыкант зможа выканаць нейкую мэлёдыю.

Думаньне і перамена матэрыі

Падчас думаньня ў мазгу адбываецца больш інтэнсыўная, як звычайна, перамена матэрыі. З гэтага факту матэрыялісты так-жа стараліся зрабіць карысны для сябе высновак, што думаньне ёсьць нейкім сваеасаблівым матэрыяльным актам. Аднак думка ня мае нічога матэрыяльнага, а што да перамены матэрыі падчас думаньня, дык і падчас перасыланьня дэпэшы праз электрычныя правады ў гэтых правадох адбываецца адпаведная перамена матэрыі — рух дрыбінаў у дроце па якім йдзе гэтая дэпэша, але самая дэпэша, яе зьмест, не зьяўляецца адзіным вынікам дзейнасьці дроту, а інтэлігэнтнае істоты-тэлеграфіста, які таксама неабходны для наданьня дэпэшы, як душа для думаньня.

Перамена матэрыі суправаджае кожную арганічную дзейнасьць у арганізьме, але з тою розьніцаю, што чыста арганічная ніжэйшая дзейнасьць адбываецца бяз удзелу нашае волі; мы яе нават ня бачым а часта і ня ведаем аб ёй. Прыкладна: ператварэньне пажывы ў страўных органах; якія там адбываюцца працэсы і рэакцыі, кудэю і як прайходзіць пажыва, пакуль стане складоваю часткаю арганізму, мала хто ведае, а калі й ведае, дык ня вельмі над гэтым задумоўваецца. Думаньне наадварот адбываецца зусім сьведама — арганічнае перамены матэрыі, якая адбываецца падчас думаньня мы нясьведамы, але сам працэс думаньня і разважаньня для кожнага чалавека заўсёды сьведамы.

Перавага душы над целам

Калі кажацца, што душа залежыць ад цела, дык гэтым зусім не гаворыцца, што душа падпарадкаваная целу. Праўда часта можна спаткаць людзей у якіх душа на толькі падпарадкаваная целу, што й сьлядоў яе цяжка заўважыць, але гэта дзеецца тады, калі чалавек сам дапусьціць да гэтага. Аднак з прыроды рэчы душа з кожнага гледзішча пераважае над целам. Як зьмест напісанага сказу перавышае пяро й чэрню, якія іх пісалі, так душа перавышае мазгі.

ДУША ПАНУЕ НАД ЦЕЛАМ

Душа ня толькі перавышае, ня толькі можа панаваць над целам, але запраўды над ім пануе, валадарыць над ім. Аб гэтым кожны можна пераканацца на сабе і на іншых.

Аб чым сьведчаць дабравольныя галадоўкі вязьняў? аб чым сьведчыць пост аскетаў? Сьмяюцца часта з вялікіх вучоных, што яны вельмі

забудзькаватыя, але аб чым гэта сьведчыць? Архімэд у абложаным горадзе так быў заняты канструкцыяю новае машыны, што ня чуў, калі ворагі здабылі горад, ня чуў, як да яго падбег чужы жаўнер з паднятым мячом, толькі як той наступіў нагою на яго намаляваны на пяску плян, вучоны азваўся: «памалу, памалу, ня псуй мне пляну!»

Калі музык віртуоз захопіцца граньнем, дык хоць з гарматаў страляй каля яго, не пачуе. Падчас інтэнсыўнае ўмысловае працы, чалавек нават аб ежы забываецца. Што адбываецца тады ў арганізьме, чаму тады змыслы перастаюць дзейнічаць? Ці можа самае цела забывацца аб сваіх патрэбах, калі на дім не пануе нехта мацнейшы?

ВОЛЬНАЯ ВОЛЯ

Але маем нязьлічаную колькасьць прыкладаў, калі людзі выразна супроцьстаўляцца жаданьням змыслаў. Ці-ж цела можа само сабе супярэчыць? Раненаму хочацца піць, а яму кажуць: «ні кроплі вады» і ён слухаецца. Ачуньваючы ад тыфу хоча есьці як воўк, а яму ледва на адзін зуб нешта дадуць перакусіць і ён слухаецца. Перамучаны жаўнер хоча спаць, а яму кажуць вартаваць і ён перамагае сон. Сьвятому Пракопу укладаюць у руку кадзіла, упіхаюць руку ў агонь перад аўтаром ідала і кажуць: «Толькі рашчамі руку і высып кадзіла перад бажком, і будзеш паганінам» гарыць жывое цела, шалёная боль праймае сьвятога, аблічча курчыцца ад спазмаў, але рука не рашчэмліваецца. Якая-ж гэта сіла валадарыць целам? Нават у тых выпадках калі чалавек робіць нешта з прымусу, заўсёды ён мае сьведамасьць, што ён мае магчымасьць выбару рабіць інакш. Калі-ж з гэтае магчымасьці выбару часта не карыстае, дык гэта не азначае, што яе няма.

Матэрыялісты і ўсякае масьці бязбожнікі кажуць, што чалавек ува ўсіх сваіх учынках паводзіцца так, як ён узгадаваны і які на яго мае ўплыў асяродзьдзе. Але к чаму-ж тады ўзгадаваньне, як няма вольнае волі? Зьвяроў як ні муштруюць, яны ўсёроўна астаюцца зьвярамі. Пакуль на іх глядзіць даглядчык, дык выконваюць тое, што вывучыліся ў муштры, а па-за тым зноў кіруюцца толькі сваімі інстынктамі. Асяродзьдзе на іх так-жа ня мае ўплыву. Коні, каровы, сабакі, сьвіньні, каты ўжо цэлыя тысячагодзьдзі жывуць у асяродзьдзі чалавека але ніякага поступу ня выказваюць. Колькі гэта было крыку ў прэсе, калі малпа ў батанічным агародзе «дадумалася» падложанымі ёй каламі прыцягнуць да сябе бананы з кошыка. Але зачым-жа гэткую «мудрую» малпу ў клетку саджаць? навошта ёй бананы падрыхтоўваць, дзеля чаго прыносіць і прыладжваць калы? хай бы яна сама гэта зрабіла і замест сябе ў клетку таго майстра пасадзіла, тады запраўды відаць было-б, што нечага навучылася.

Калі-б чалавек ня меў свабоднае й вольнае волі, дык як выясьніць паводзіны самых матэрыялістых, бо няма ніводнага з іх, які-б ня прызнаваў дрэнных учынкаў, злочынаў і не караў за гэткія ўчынкі.

Аджа калі ў чалавеку няма вольнае волі, дык ён ня можа выбіраць, дык зашто яго судзіць? Ці судзілі калі воўка за тое, што зьеў авечку? А нават і ў бязбожных дзяржавых ёсьць суд і пакараньне, ды яшчэ якое!

У таталітарных дзяржавах і газэты, і школа, і радыё, і ўрад, і ўсякае ўзгадаваўчае асяродзьдзе толькі аднаго напрамку — дык адкуль-жа зьяўляюцца там людзі, інакш думаючыя, калі няма вольнае волі?

Беспярэчна чалавек бальшыню сваіх што-

дзенных учынкаў робіць мэханічна, папрывычцы; аднак калі зьяўляецца патрэба, каб вольная воля сказала сваё «слова», тады яна выяўляецца.

Так сама ёсьць факт, што ня шмат ёсьць выпадкаў дзе вольная воля супраціўляецца целу, але ня трэба забывацца, што супраціў целу вольнае волі раўназначны ўнутранай вайне: як ў грамадзкім жыцьці супакойнае жыцьцё лічыцца на даўжэйшыя гады чым вайна, так і супраціў волі да вымогаў цела магчыма менш шматлікі. Але ён ёсьць і гэта самае важнае, бо ён зьяўляецца нязьбітым доказам, што ў чалавеку ёсьць нешта вышэйшае й магутнейшае за цела.

Выкананьне свайго абавязку і датрыманьне слова гонару нават паміж недаверкамі і нават коштам свайго жыцьця та́к-жа вымоўна выяўляе аб існаваньні ў іх нечага мацнейшага за цела.

СУМЛЕНЬНЕ

Не ад аднаго супраціўніка душы можна часам пачуць: «Калі ў нас ёсьць нейкая розная ад цела душа, дык чаму яна хоць раз не акажацца?» З вышэй пералічаных фактаў ясна, што душа аказваецца ня раз, але нязьлічаную колькасьць разоў, толькі што яе «голасу» слухаць ня хочуць, а прыпісваюць то мазгом то нэрвам. Аднак здараюцца выпадкі, калі душа адзываецца ў асаблівы спосаб і яе голасу да ніякога органу ў целе чалавека прыпісаць ня могуць. Гэткім асаблівым голасам душы ёсьць сумленьне. Калі нехта меў няшчасьце зрабіць дрэнны ўчынак, дык напэўна адчуў «як кошкі скрэбаюць за сэрца». Няраз яны аж за моцна скрабуць, але кіпцюроў іх знайсьці ў нашым целе нельга, бо яны нематэрыяльныя. Калі-ж добрае зрабіў — адчуваў вялікую радасьць.

ДУХОВАСЬЦЬ ДУШЫ

ШТО ТАКОЕ ДУХ?

Аб тым, што ў чалавеку, акрамя цела, ёсьць яшчэ Нешта, мала хто пярэчыць, але ўся цяжкасьць і вага пытаньня вырынае тады, калі кажам, што гэнае Нешта — гэта духовая душа. Што гэнае Нешта розьніцца ад цела, так-жа самазразумела, але мы кажам, што душа істотна розьніцца ад цела, бо цела збудаванае з матэрыі, а душа з нейкае такое субстанцыі, што не падлягае ніякім даступным нам досьледам, тымняменш яна такая-ж канкрэтная, як нашы думкі, як нашы паняцьці. Хоць кожны з нас мае духовую душу, аднак цяжка нам уявіць самую духовасьць, бо мы ў штодзенным дзеяньні вельмі зжыліся з матэрыяю. Для выясьненьня можна толькі сказаць, што дух гэта найпрасьцейшая, зусім нязложаная субстанцыя, ня маючая ніякіх матэрыяльных азнакаў.

Для лягчэйшага зразуменьня, што такое дух затрымаймася хвіліну над нашаю думкаю. — Яна ня зьвязаная ні з мейсцам, ні з часам, ні з прасторам; зусім добра можам думаць аб вакольных здарэньнях і аб тым, што адбываецца на зорах; аб тым, што дзеецца цяпер і аб тым, што было сотні гадоў назад. Ані думку можна зважыць, ані

яе памераць, ані панюхаць, ані пасмакаваць, ані яе пабачыць, бо няма думкі зялёнае, ці жоўтае. Таму і дасьледаваць душу, так як дасьледуюць матэрыю ёсьць недарэчнасьцю. Тымняменш з лёгкае рукі фр. лекара Бруссэ часта раней можна было пачуць яго сказ: «Я ніколі не знайшоў душы на вастрыі майго скальпеля». Гэта бесьпярэчная праўда. Але калі аднойчы на бязбожніцкім мітынгу адзін з прапагандыстых заявіў, што лекары падчас вівісэкцыі перашукалі ўсё цела і душы не знайшлі, дык адзін з прысутных там навуковых працаўнікоў заявіў: «Я быў на сэкцыі мазгоў тав. Леніна; найслаўнейшыя прафэсары перашукалі ўсе мазгі і розуму там не знайшлі». Гэта яшчэ большая праўда, бо так розум, як і яго вытвары: паняцьці, суды, ідэі — ня маюць ніякае матэрыяльнасьці, дык і знайсьці іх скальпелям нельга, падобна як і самае душы.

Шмат менш недарэчным выглядала-б стараньне праткнуць голкаю сонца, чым скальпелем, або нейкім іншым нажом знайсьці душу.

Бо ці трэба яшчэ гаварыць аб тым, што мазгі матэрыяльныя і яны заўсёды астаюцца ў галаве, а думкі, якія вытварае душа з помаччу гэтых-жа мазгоў, то паўстаюць, то зьнікаюць, так што іх часта нават трудна, як то кажуць, злавіць.

Думаньне і мова.

Ды й ці агулам патрэбна шукаць скальпелям, або нейкім іншым долатам душы, калі яна праяўляецца сваімі сіламі: розумам і вольнаю воляю так ясна на вонках, што калі іх нехта ня хоча бачыць, дык хіба толькі той, хто гледзячы на сонца здаровымі вачыма, сьвету ня бачыць.

Разумная істота можа думаць і сваю думку

на вонках выказвае мовою, таму з усіх ствараньняў на зямлі толькі чалавек можа гаварыць, а іншыя жывёлы, хоць і маюць зусім добра прыстасаваныя да мовы галасавыя струны, вусны, язык, аднак не гавораць, — бо ня думаюць, бо ня маюць аб чым гаварыць, бо ня маюць разумнае і духовае душы. Хто ня чуў папугаяў, як яны балбочуць людзкія словы? Шпакі, дразды і вароны так-жа могуць вымаўляць некаторыя людзкія словы, але як ні дзіўна, гаварыць, як гаворыць чалавек, яны ня могуць, бо ня маюць аб чым, бо ня думаюць. Толькі разумная і духовая душа вытварае думку, а думка мову.

Усе стараньні знайсьці нейкую мову малпаў, скончыліся нічым. Некаторыя дасьледнікі былі зарэгістравалі аж 70 малпячых «слоў», але самыя-ж іх адкрыўцы ўканцы мусілі прызнаць іх за звычайныя гукі змысловае натуры для выказваньня: болю, задаваленьня, трывогі і т. п., якія ня маюць нічога супольнага з членаразьдельнаю мовою людзей, а тым самым і з думаньнем.

Агульныя паняцьці.

Міма таго, што нашы думкі і нашы ідэі нематэрыяльныя ў іх рэальнасьці ніхто ня сумняецца. Бесьпярэчна так-жа што яны астаюцца негдзе ў нас, але так-жа бесьпярэчна, што яны ня маюць ніякае матэрыяльнасьці. Варта толькі прыглянуцца да першага лепшага агульнага паняцьця, каб у гэтым пераканацца. Прыкладна возьмем найпрасьцейшае і найагульнейшае паняцьце, дрэва, — яно ня кажа ні аб нейкай азначанай велічыні, ні колеру, ні ліку гальля ці лісьця, нават формы азначанае ня мае — аднак гэтае разумовае паняцьце існуе і мы ім вельмі добра і часта карыстаемся. У навуцы ёсьць цэлая безьліч гэткіх ра-

зумовых паняцьцяў, а такая сьцїслая навука, як матэматыка, дык апіраецца амаль выключна на абстрактна-разумовых паняцьцях, пачынаючы ад матэматычнага пункту, а канчаючы на бесканечнасьці. Падобна фізыка і астраномія б'яз гэткіх паняцьцяў ня былі-б навукамі, хоць гэтых паняцьцяў ані скальпелем не абмацаеш, ані ў мікраскоп на іх не паглянеш, зусім так, як і на самую нашу душу.

Сьведамасьць.

Ня толькі нашы думкі, але самая сьведамасьць, самае нашае «я» пазбаўлена ўсякае матэрыяльнасьці. Найлепш гэта відаць з таго агульна ведамага факту, што нашае цела зьмяняецца штодня так, што праз якіх 7, а найбольш 8 гадоў не астаецца ніводнае часткі ні мяса, ні костак, ні мазгоў, якія-б не замяніліся, але не зважаючы на гэта кожны з нас заўсёды гаворыць Я і ў дзяцінстве, і ў юнацтве, і ў старасьці — дык што-ж асталося ў нашай сьведамасьці, калі за гэты час некалькі разоў мусіла зьмяніцца матэрыя нашага цела? Былі галасы некаторых матэрыялістаў, што адна каморачка, гінучы перадае свае ўражаньні іншай, але калі пабачылі, што з гэткае дагадкі выходзіла-б, што паасобныя каморачкі мусілі-б быць разумнейшыя, як увесь чалавек, пакінулі гэткую думку. Шукаючы адказу ў дыялектычным матэрыялізьме, некаторыя пробавалі адгаворвацца пустымі словамі, што сьведамасьць ёсьць нейкім вытварам энэргіі, але і на гэтае пустое гавораньне самі-ж матэрыялісты ў 1928 г. на зьезьдзе натуралістых у Ленінградзе з вуснаў Вэрнацкага мусілі пачуць; што «сьведамасьць і думка ня могуць быць зьведзены да энэргіі, ані да матэрыі». Ды яшчэ раней матэрыяліст Лянгэ ў сваёй «Гісторыі матэрыялізму» наткнуўся на гэтую цяж-

касьць. Ён так-жа знайшоў цэлы сьцяг пытаньняў без адказу: «Дзе ёсьць мейсца адчуваньня, калі прыймаем атамы? Ці яно ў сувязі атамаў? Але тады яно дзесьці ў абстрактнасьці, гэта значыць аб'ектыўна нідзе. Ці яно ў руху? Але гэта былоб тое самае. Можна толькі прыняць атам, які рухаецца, як мейсца ўспрыйманьня адчуваньняў. Але як тады адчуваньні складаюцца разам ў адну сьведамасьць? Ды дзе знайходзіцца гэтая апошняя? Ці ў адным адзіным атаме, ці зноў у абстракцыі, або зусім у парожным прасторы, які ў сваю чаргу мусіў-бы быць не парожны, але напоўнены нейкаю нематэрыяльнаю субстанцыяю...»

Адгэтуль ясны выснавак, што нашае «Я» — гэта нешта зусім рознае ад нашага цела і нематэрыяльнае, бо ў целе мы яго ня можам нідзе зьвязаць з якім небудзь органам.

Да гэтага самага выснаўку вядзе нас застанова над нашымі ўспамінамі, якія ня могуць ляжаць у атамах, што заўсёды зьмяняюцца. Магчыма хіба дапусьціць, што яны ляжаць у адносінах складовых частак, бо ўсяго гэтыя адносіны трывалыя. Але што гэта такое, гэтыя думаючыя і ўспамінаючыя аб сабе адносіны? Гэта толькі гаворка закрываючая незнаньне матэрыялістаў.

У целе чалавека ёсьць больш трох мільярдаў каморачак, а сьведамасьць толькі адна. Хоць яна знайходзіцца ў целе, але рэжучы цела на кавалкі, сьведамасьці зусім не закранаем. Чалавек з паабразанымі рукамі й нагамі, ані на валасок ня мае абрэзанае сьведамасьці, і гэта найясьней паказвае, што сьведамасьць ёсьць нечым зусім розным ад нашага цела.

Непадзельнасьць «Я».

Аснаўная азнака духа ёсьць яго непадзельнасьць. Гэтую азнаку мы знайходзім у нашей сьведамасьці й думках. Цела лёгка можна падзяліць на якія хочаш часткі, а сьведамасьць ніяк. Ужо філязоф Дэкарт казаў: «Я не магу ўявіць нейкае палавіны маіх магчымасьцяў: адчуваць, хацець, цяміць... бо няма частак у маім духу, але ўвесь мой дух адчувае, увесь хоча, увесь разважае... Мой дух, што думае, ёсьць абсалютна адным суцэльным і непадзельным. Калі ў нашым целе зьявіцца верад ці нараст, які нам далягае, дык яго можна выразаць, пазбыцца, але калі ў нашай памяці, ці ў сумленьні зьявіцца нешта, што нас мучыць, дык нельга яго ані выразаць, ані вырваць. Колькі марокі прыносяць нам няпрыемныя ўспаміны, але выкінуць іх з памяці няма сілы, бо наша памяць належыць да субстанцыяў нематэрыялньных і непадзельных — яна духовая».

ПАХОДЖАНЬНЕ ДУШЫ.

Адкуль-жа бярэцца духовая душа ў чалавеку? Ці яе разам з целым даюць дзецям бацькі? Паводля адназгоднае навукі ўсіх хрысьціянскіх вучоных душу кажнаразова творыць Бог і дае яе чалавеку ў мамэнце яго зачацьця. Ня будзем тут перачысьляць розных іншых тэорыяў і дагадкаў, бо беларускі народ і так ніколі ня сумніваўся ў тым, што душа паходзіць ад Бога. Аб няздарах народная мудрасьць кажа: «Усадзіў Бог душу ні ў пень, ні ў грушу».

Але з гэтага вынікае, што чалавек ад мамэнту зачацьця, гэта значыць ад мамэнту злучэньня душы з целам ёсьць поўнавартасным чалавекам, які мае права ўважаць Бога за свойго Айца Ня-

беснага і, дайшоўшы да мамэнту ўжываньня розуму, зьвяртацца да Яго: «Ойча наш, каторы ёсьць на небе!»

АБРАЗ І ПАДАБЕНСТВА БОЖАЕ.

У сьвятым Пісаньні ёсьць сказ, што Бог сатварыў чалавека на свой абраз і падабенства (Быц. 1, 26). Гэты абраз Божы ня ёсьць у целе, бо некаторыя жывёлы маюць цела ў шмат чым вельмі падобнае да людзкога, але ня маюць абразу Божага. Вось-жа гэтае падабенства ёсьць у разумнай і духовай душы.

Бог ёсьць бесканечны, а ў чалавеку ўсяго дробненькая іскарка з яго дасканаласьці, аднак яна запраўды выяўляе вельмі вымоўна сваё боскае паходжаньне. Бог ёсьць Створцам сусьвету, а чалавек, дзякуючы іскры Божай — сваёй разумнай душы — так-жа бязустанку памнажае свае творы культуры і цывілізацыі. Жывёлы нават з высокаарганізаванымі інстынктамі, астаюцца на адной ступені, ні на крок ня ступаючы ўпярод, а чалавек амаль штодня вынайходзіць нешта новае, заўсёды нешта «творыць».

Як Бог у Сабе ёсьць самая Любоў, Праўда і Дабро, так дробная іскра Божая ў чалавеку вечна гоніць яго змагацца за праўду, шукаць любові і ненасытна жадаць дабра. Колькі гэта каштуе цярпеньня, колькі ахвяраў! аднак гэта не адстрашвае чалавека, бо ў гэтым бачыць сваё шчасьце. Блукаемся мы часта па розных звадлівых шляхох у гэтых пошуках; замест праўдзівага сьвету Праўды, часта ўганяемся да змору за блуднымі вогнікамі, але шукаць ніколі не перастаем. Калі-ж ясна выявяцца нашы дрэнныя ўчынкі —

саромяемся іх. Адзін чалавек з усіх сатварэньняў на Зямлі мае пачуцьцё сарамязьлівасьці, бо адзін-жа ён мае тую Божую іскру — душу.

НЯСЬМЯРОТНАСЬЦЬ ДУШЫ.

Аб чым нясьведама сьведчаць ворагі?

Магчыма, што ня было-б зусім праціўнікаў існаваньня душы, каб душа гінула з мамэнтам сьмерці чалавека. Аднак таму, што наглядна і лягічна з духовасьці душы вынікае яе несьмяротнасьць, тыя, каму гэта не на руку, шукаюць розных спосабаў пазбыцца гэтае няпрыемнае для іх думкі; найчасьцей бяз ніякіх доказаў, ні за, ані супарць — проста адкідаюць гэтую думку. Аднак хоць, як злодзей хоча, каб заўсёды была цёмная ноч — сонца ўсходзіць і настае ясны дзень. Хоць як стараюцца людзі з нячыстым сумленьнем зацыткаць прыглушаны голас гэтага-ж сумленьня аб вечным існаваньні душы і голас розуму аб праўдзе гэтае думкі — запраўднасьці яны зьмяніць ня могуць, наадварот — гэты страх зьяўляецца адным доказам больш, што ён не дарэмны, а мае нейкую рэальную аснову.

Душа не раскладаецца.

Сьмерць жывога арганізму — гэта разлучэньне на суставуныя часткі. Фізычная сьмерць чалавека настае тады, калі душа разьдзяляецца з целам. Але як-жа можа ўмерці сама душа, калі яна простая і ня мае ніякіх частак? Калі навучныя досьледы паказваюць, што матэрыя ў сваіх асноўных складнікох нязьнішчальная, дык тымбольш нязьнішчальная душа.

Божая воля.

Адзіная сіла, якая магла-б зьнішчыць душу ёсьць Бог, але якраз Бог выразна і шматразова вуснамі сваіх прарокаў і Сам Ісус Хрыстос, аб'явіў людзям, што душа прызначана для жыцьця вечнага. Усё сьв. Пісаньне аднагодна сьведчыць аб гэтым. Уся навука Хрыста — гэта навука аб тым, як спасьці сваю душу для вечнага жыцьця.

Хто ня чытае сьв. Пісаньня, дык тую самую праўду мусіць вычытаць у прыродзе, дзе так-жа выразна Божаю рукою выпісана на кожным камені і на кожнай пясчынцы, што раз створанага Бог ня зьнішчае.

Агульнае перакананьне.

Людзі ў сваіх думках памыляюцца часта; аднак, калі аб нечым усе аднагодна пераканаты, дык з такою думкаю нельга ня лічыцца. А думка аб несьмяротнасьці душы ад таго часу, як чалавек стаўся чалавекам, неадступна суправаджала ўсё жыцьцё чалавека. Толькі новая цывілізацыя нарадзіла недаверкаў у несьмяротнасьць душы, але і то параўнальна ня шмат, захопліваючы толькі некаторыя кругі.

Праўда, самую душы ўяўлялі заўсёды неаднолькава і яе пазагробнае жыцьцё так-жа часам вельмі фантастычна, але не сумляваліся ў самае гэтае жыцьцё. Старыя курганы і розныя хаўтурныя абрады так даўней, як і сёньня ўва ўсіх народаў і плямёнаў сьведчаць аб гэтым аднагодна.

Уроджанае жаданьне.

Нават як-бы сёньня была бальшыня недаверкаў, дык можна і трэба спасылацца на агульнае

перакананьне людзей у несьмяротнасьць, як на пераконваючы доказ, бо гэтае перакананьне не зьяўляецца творам фантазіі, як гэта стараюцца даказаць матэрыялісты, але яно ёсьць уроджаным жаданьнем чалавека. Калі-ж усе нечага жадаюць з прыроды, дык ім, паводля праў тае-ж прыроды, мусіць нешта адказваць канкрэтнае. Падобна як кожны інстынкт жывёлаў мае сваё апраўданьне ў нейкім канкрэтным прыродным зьявішчы, так людзкое жаданьне несьмяротнасьці мае сваё апраўданьне ў факце існаваньня пазагробнага жыцьця. Нават шматлікія матэрыялісты ня могуць вызбыцца гэтага жаданьня і каб заспакоіць сваё сумленьне шукаюць гэтае несьмяротнасьці ў матэрыяльнай форме — у прадоўжаньні свайго роду.

Вымогі справядлівасьці.

У дачасным, земскім жыцьці чалавека дзеецца толькі крыўдаў, толькі няпраўды, якія астаюцца непакаранымі, а з другога боку чэсныя і справядлівыя людзі часта мусяць пераносіць такую бяду і цярпеньні ,што як-бы за гэта ніколі ня было справядлівае нагароды, жыцьцё было-б пазбаўлена свайго сэнсу. Аднак дапусьціць гэткае думкі нельга нават з чыста разумовага гледзішча, бо ў прыродзе ўсюды мы бачым лад і парадак.

У сьв. Пісаньні найпрыгажэйшы прыклад справядлівасьці знайходзім у прыповесьці аб багачу і Лазару (Лук. 16, 19-31). Баляваў багацей штодзенна, забыўшыся аб Божых прыказаньнях, крыўдзіў і зьдзекаваўся з іншых, а над бедным Лазарам толькі сабакі літаваліся, залізваючы яго раны, але ня доўга гэта трывала — пасьля сьмерці палажэньне іх зьмянілася. Тады й адзываецца Аўраам да несправядлівага багацея: «Сыне! пры-

помні. што ў жыцьці тваім меў ты добрае, а Лазар благое; цяпер-жа ён тут пацяшаецца, а ты церпіш вялікія мукі».

Пры гэтай нагодзе трэба абавязкава зрабіць засьцярогу, што самае прызнаньне загробнае нагароды за цярпеньні ў дачасным жыцьці зусім не звальняе чалавека ад змаганьня за справядлівасьць, наадварот на кожнага накладае абавязак прыймаць удзел у гэтым змаганьні. Але змаганьне гэта яшчэ не самая справядлівасьць; ды ў змаганьні ўсяк здараецца дык нагарода і за змаганьне, і за цярпеньне мусіць быць у іншым жыцьці.

Раней бязбожніцкая прапаганда казала: «Разумныя дурням аддалі неба, каб самым прасторней было жыць на зямлі», але сёньня мы бачым, што запраўды гэта бязбожнікі стараюцца адкінуць неба, каб самым безадказна жыць на зямлі. Аднак як чалавек бясьсільны супраць сьмерці, так ён ня у стане зьмяніць тае справядлівасьці, якая чакае кожнага ў пазагробным жыцьці.

РАТУЙ СВАЮ ДУШУ.

Практычным высноўкам з усяго вышэй сказанага мусіць быць вось гэты кліч: «Ратуй сваю душу! Бо душа гэта ня толькі найбольшы наш скарб, але й адзіны, які прызначаны для вечнага існаваньня. Усё дачаснае мінецца, ўсё калісьці пакінем, толькі адзіная душа з сваімі ўчынкамі пойдзе ў іншы сьвет».

Здаровы і поўны сілы чалавек вельмі часта забываецца аб гэтым найважнейшым абавязку свайго жыцьця, але ў часе немачы, калі вязі ду-

шы й цела слабеюць, калі душа пачынае судакранацца з тым іншым сьветам, тады зьяўляюцца розныя «прывіды» і «зданьні», якія абуджаюць прыспаны голас нават неаднаго закамянелага грэшніка, таму на ложу сьмерці вельмі часта навяртаюцца, але найчасьцей тады ўжо няма часу для направы свайго затрачанага жыцьця.

Таму вось гэтых некалькі думак прызначаны для таго, каб загадзя падбаць аб вечнасьці свае душы.

Курганы.

На Беларусі нямала ёсьць памятак мінулага, але магчыма найцікавейшымі з іх ёсьць старавечныя курганы. Хаваюць яны не адну гістарычную тайніцу, прамоўчваюць яны аб шмат чым, але аб найважнейшым яны сьведчаць бязустанку. Таму дарма зьвяртаецца да іх паэт:

Гэй, спрадвечныя курганы
Даўных спраў вартаўнікі!
Эх, ня скажаце ніколі,
Што казалі вам вякі.

Праўды не аб усім яны кажуць, але аб найважнейшай праўдзе жыцьця, яны кожнаму крычма крычаць:

«Памятай аб сваёй душы. Для яе ратунку не шкадуй ніякага труду. Хоць горы трэба пераварочваць дзеля гэтага, дык выканаць гэта неабход-

на, а прыкладам у гэтым можам служыць табе мы — тваe слаўныя продкі, якія для дабра душы насыпалі гэтыя курганы».

ЗЬМЕСТ.

Impr. de Navarre, 11, rue des Cordelières, Paris.